# У ГАСЦЯХ У БІБЛІЯТЭКАРАЎ

Традыцыйна напярэдадні і ў Дзень бібліятэк, які адзначаецца ў нашай краіне 15 верасня, у віцебскіх бібліятэках ладзяцца цікавыя мерапрыемствы, наведаць якія можа кожны ахвотны. Мне ў гэтым сэнсе пашанцавала двойчы: я патрапіла і ў абласную бібліятэку імя У.І. Леніна, і ў навуковую бібліятэку нашага ўніверсітэта.

14 верасня мы, студэнты 21/2 групы, на чале з Таццянай Уладзіміраўнай Аляксеевай накіраваліся ў «ленінку» на літаратурна-музычную вечарыну «Скарынаву кнігу ў вечнасць пусціць...», прысвечаную 500-годдзю беларускага кнігадрукавання і нашаму першадрукару Францыску Скарыну.

Затым мы наведалі арганізаваныя бібліятэкай выставы: «Свет перыёдыкі», «Дзіцячы час», «Смачныя кнігі». На апошняй былі прадстаўлены кнігі па кулінарыі. Асабіста мяне найбольш уразіла выстава самаробных кніг «Кнігу горада гартаючы», у арганізацыі якой прынялі ўдзел амаль усе раённыя цэнтры Віцебскай вобласці. На выставе былі прадстаўлены самаробныя кнігі, прысвечаныя розным гарадам Віцебшчыны. Найбольш запомніліся мне работы з Глыбокага, Дуброўна і Сянно. А як прыемна было ўбачыць кнігу, прысвечаную майму роднаму гораду Браславу! Выданне «Табе, мой край» было шыкоўна аформлена, з каляровымі малюнкамі і прыгожай вокладкай.



У гэты дзень у бібліятэцы мы мелі магчымасць паслухаць мелодыі ў выкананні саксафаністаў, а таксама прыняць удзел у акцыі «Чытач – чытачу».

15 верасня бібліятэкары нашай альма-матар разам з супрацоўнікамі аддзела студэнцкай творчасці і культурна-забаўляльнай дзейнасці правялі шэраг цікавых мерапрыемстваў. Так, студэнты філалагічнага факультэта чыталі вершы вядомых паэтаў у літаратурна-музычнай гасцёўні, усе ахвотныя маглі паўдзельнічаць у квэсце «Бібліятэчныя лабірынты», а хлопцы і дзяўчаты мастацка-графічнага факультэта прапаноўвалі намаляваць партрэт ці зрабіць роспіс хной.

Акрамя таго, кожны мог у гэты дзень павіншаваць любімую бібліятэку і яе супрацоўнікаў са святам, напісаўшы колькі добрых слоў на аркушы паперы і замацаваўшы яго на спецыяльнай дошцы. Я ж хачу падзякаваць усім бібліятэкарам за іх складаную, але такую неабходную працу!

**Алеся МЯДЗІЛЬ,**
**студэнтка 2 курса ФлФ.**

**На здымку:** падчас мерапрыемства ў навуковай бібліятэцы ВНУ.

**Фота В. ЛУЗГІНОЙ.**